# Архаічныя антрапаморфныя і зааморфныя вобразы і іх сувязь з традыцыйнымі беларускімі цацкамі

Емялёва Г. Ю.
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», Мінск*



*Артыкул прысвечаны традыцыйным беларускім абрадавым і пазаабрадавым цацкам. У працы разглядаюцца антрапа- і зааморфныя вобразы палеалітычнага мастацтва Еўразіі, артэфакты археалагічных помнікаў каменнага веку на тэрыторыі Беларусі і блізкіх па культуры тэрыторыях. На основе археалагічных і этнаграфічных матэрыялаў аўтар вылучае асноўныя антрапаморфныя і зааморфныя вобразы, уласцівыя матэрыяльнай культуры Беларусі, такія, як вобраз жанчыны, мужчыны, птушкі, каня, быка, казла, барана, лася, мядзведзя, ваўка, змяі, рыбы і інш. Аналізуючы традыцыйныя беларускія тэкстыльныя, драўляныя і керамічныя цацкі XIX-XX стст., аўтар прыходзіць да высновы, што большасць цацачных вобразаў з'явіліся на тэрыторыі Беларусі яшчэ ў старажытнасці. У якасці характэрных рысаў падкрэсліваюцца іх выразнасць, архаічная прастата і ўнутраная статыка.*

*Ключавыя словы:* *цацкі беларускія, вобразы антрапаморфныя, вобразы зааморфныя.*
(Искусство и культура. — 2012. — № 3(7). — С. 73-79}

# Anthropomorphic and zoomorphic archaic and images their connection with traditional Belarusian toys

Emialeva H. Y,
*Educational establishment «Belarusian State University of Culture and Arts», Minsk*

*This paper is devoted to traditional Belarusian ritual and non-ritual toys. The paper deals with anthropomorphic and zoomorphic images of Eurasian Paleolithic art, Stone Age artifacts on the Belarusian territory and similar cultural monuments. On the basis of archaeological and ethnographic materials the author identifies the major anthropomorphic and zoomorphic images inherent in the material culture of Belarus, such as the image of women, men, birds, horses, cattle, goat, sheep, moose, hears, wolves, snakes, fish and others. Analyzing traditional Belarusian textile, wood and ceramic toys of the XIX-XX centuries the author concludes, that most toy images appeared on the territory of Belarus in ancient times. It emphasizes their features: expressiveness, archaic simplicity and internal static. Key words:: Belarusian toys, anthropomorphic images, zoomorphic images.*

Цікавасць да даследавання найбольш старажытнай, палеалітычнай культуры значна павялічылася ўжо пачынаючы з XIX ст., калі адбылося адкрыццё першых прыкладаў палеалітычнага мастацтва, З гэтага часу ўзмацняецца ўвага і да традыцыйных культур, матэрыялы даследавання якіх часта выкарыстоўваюцца для асэнсавання першабытнай культуры і наадварот, Першабытнай куль-

(Art and Culture. — 2012. — № 3(7). — P. 73-79)

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* eloiseA@yandex.by - Г. Ю. Емялёва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры і мастацтву прысвечаны працы З. А. Абрамавай, А. П. Акладнікава, Я. Елінэка, П. П. Ефіменкі, С. М. Замятніна, А. Д. Столяра, А. А. Фармозава, Б. А, Фралова і інш. Што датычыцца старажытнай культуры і мастацтва Беларусі, тэарэтычнымі даследаваннямі ў гэтым накірунку з'яўляюцца працы Э. М. Зайкоўскага, Л. У. Дучыц, Л. У. Калядзінскага, М. М. Чарняўскага, а дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, у прыватнасці цацка, найбольш поўна прадстаўлена ў працах С. У. Касцюкевіч, Я. М. Сахуты, М. С. Ржавуцкага.

Мэта дадзенага артыкула - выяўленне асноўных для беларускай культуры антрапаморфных і зааморфных вобразаў, іх паходжання і ўвасаблення ў беларускай традыцыйнай цаццы.

**Антрапаморфныя вобразы.** З гісторыі культуры вядома, што першыя антрапаморфныя вобразы з'явіліся ўжо ў эпоху палеаліту. На тэрыторыі Еўразіі знаходзяць дробную антрапаморфную пластыку, розную па ступені рэалізму і дэталізацыі, створаную яшчэ ў верхнім палеаліце [1, с. 249]. Гэта фігуры жанчын (якія сустракаюцца часцей за ўсё], фігуры мужчын, камбінаваныя абоеполыя фігуркі, знойдзеныя асобна чалавечыя галовы, фрагменты тулава, а таксама «знакі полу». Найбольш старажытнымі лічацца фігуркі з Хлум, Ла Ферасі, Брасэмпуі, Віллендорфа, Лінзэнберга, Мауэрна і інш. Памер такой пластыкі не перавышае 20 см, матэрыял - камень, бівень мамата, костка, гліна, пясчанік, вапняк і да т. п. Сярод пазнейшых палеалітычных знаходак сустракаюцца таксама антрапаморфныя рэльефныя, а пасля і графічныя выявы.

Фігуркі жанчын складаюць большую частку палеалітычных антрапаморфных знаходак. Нягледзячы на тое, што паходзяць яны з розных, значна аддаленых паміж сабой тэрыторый, фігуркі маюць шмат агульнага. Семантыку жаночага вобраза, настолькі распаўсюджанага ў палеаліце ў параўнанні з вобразам мужчынскім, даследчыкі звязваюць з рознымі з'явамі. Так, напрыклад, П. П. Ефіменка лічыць, што вобраз палеалітычнай жанчыны звязаны з культам прарадзіцельніцы роду, прамацеры як увасабленнем кроўна-роднаснай сувязі членаў пэўнай супольнасці, з адлюстраваннем мацярынскага строю родавай арганізацыі аселых паляўнічых груп. Жанчына ў гэты час станавілася ахоўніцай вогнішча, жытла і г. д. [2, с. 400]. На думку С. М. Замятніна, гэтыя статуэткі з'яўляюцца атрыбутамі паляўнічай магіі падчас падрыхтоўкі да палявання і звязаныя з верай у магічную сувязь жанчыны-жрыцы і палявання, поспеху ў якім яна садзейнічае [3, с. 56, 57]. А. П. Акладнікаў звязвае жаночыя вобразы з культам плоднасці, а таксама з культам памерлых, культам продкаў [4, с. 44]. Некаторыя даследчыкі наогул мяркуюць, што сферай зараджэння антрапаморфнай пластыкі з'явілася ўзніклая пахавальная практыка [1, с. 238], а таксама адзначаюць, што фігуркі ў пахаваннях суправаджаюць шкілеты дарослых, а не дзяцей [5, с. 71]. Але, як слушна мяркуе А. П. Акладнікаў, «культавае ўшанаванне такіх змясцілішч душ, верагодна, не абмяжоўвалася адно толькі клопатам аб іх саміх, але праяўлялася таксама і ў рознага кшталту абрадах, звязаных з імкненнем павялічыць колькасць членаў рода, з неабходнасцю забяспечыць поспех на паляванні, павялічыць колькасць здабычы і размножыць дзікую жывёлу, якая з'яўлялася аб'ектам палявання» [4, с. 48]. Таму, на наш погляд, семантыка вобраза жанчыны ў культуры палеаліту раскрываецца ў сукупнасці сэнсаў, якімі яна надзяляецца, у сукупнасці падыходаў, кожны з якіх актуалізуецца ў залежнасці ад сітуацыі. Акрамя таго трэба адзначыць, што даследчыкамі палеалітычных культур падкрэсліваецца асаблівая важнасць таго факта, што жаночыя статуэткі часта бываюць знойдзены ўнутры жытла ў ямках каля вогнішча (пад косткамі жывёлы або каменем), ці каля развала печы [5, с. 72], што ўказвае на сувязь жаночага вобраза з хатнім агнём і жыллём, родам і яго дастаткам.

Асобна трэба сказаць пра мужчынскія выявы эпохі палеаліту, якія трапляюцца археолагам досыць рэдка. Так, цікавая пластыка знойдзена ў Брно, Брасэмпуі, Холенштэйне-Штадэне. Існуюць таксама барэльефы і графічныя выявы (мужчыны ў кампазіцыі з жывёламі, антрапазааморфныя выявы), Унікальнай з'яўляецца мужчынская выява з пахавання дарослага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

.мужчыны ў Брно. Гэта адзіная вядомая фігура чалавека, сабраная з некалькіх частак - галавы, торса, рук і ног (накшталт марыянеткі). Сярод знаходак мужчынскіх выяў яна вызначаецца сваёй старажытнасцю - яе ўзрост каля 20000-25000 год. Памеры фігуркі 13,3 см, матэрыял - бівень мамантa. Твар скульптуры дастаткова выразна прапрацаваны, знойдзены сляды чырвонай фарбы.

На тэрыторыі Беларусі палеалітычных антрапаморфных выяў не знойдзена, але на блізкай па культуры палеалітычнай стаянцы каля в. Елісеевічы (Браншчына, Расія) археолагам К. Палікарповічам была выяўлена ўнікальная жаночая фігурка, зробленая з біўня маманта. Статуэтка ўяўляе сабой аголенае жаночае цела без галавы і ніжняй часткі ног. Адносна іншых усходнееўрапейскіх знаходак яна вылучаецца стройнымі прапорцыямі і дастаткова крупнымі памерамі (15 см).

Ужо непасрэдна з беларускай тэрыторыі паходзяць дзве ўнікальныя неалітычныя знаходкі - драўляны ідал, а таксама асобны твар з косткі, знойдзеныя археолагам М. Чарняўскім на стаянцы каля в. Асавец Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці. У адрозненне ад палеалітычных жаночых фігурак, дзе акцэнт зроблены на целе, неалітычная пластыка адлюстроўвае твар, які тут выходзіць на першы план, Лічыцца, што гэтыя знаходкі ўвасабляюць вобраз мужчыны і азначаюць пераход ад матрыярхату да патрыярхату. Акрамя антрапаморфнай пластыкі, на тэрыторыі Беларусі вядомыя таксама неалітычныя графічныя выявы чалавека (верагодна, мужчыны). Гэта выявы на косці з помнікаў на воз. Вячэра (Любанскі раён Мінскай вобласці), а таксама выявы на кераміцы са стаянкі каля в. Юравічы (Калінкавіцкі раён Гомельскай вобласці) і в. Асавец (Бешанковіцкі раён Віцебскай вобласці). Такім чынам, можна адзначыць, што ўжо ў каменным веку на тэрыторыі Беларусі і блізкіх па культуры тэрыторыях існавала антрапаморфная пластыка і графіка, якая адлюстроўвала як жаночыя, так і мужчынскія вобразы. Найбольш раннія антрапаморфныя знаходкі, што паходзяць з Беларусі, датуюцца неалітам.

У перыяд бронзавага і жалезнага вякоў такія аб'екты сустракаюцца дастаткова рэдка. Напрыклад, да ранняга жалезнага веку адносяцца стылізаваныя над арнамент графічныя жаночыя выявы на кераміцы з гарадзішча каля в. івань Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Як і неалітычныя выявы, якія ўзгадваліся раней, гэтыя жаночыя выявы выразна геаметрызаваныя, але, у адрозненне ад папярэдніх знаходак, на аскепку адной з пасудзін яны ўтвараюць паласу суцэльнага арнаменту.

Да позняга перыяду першабытнай эпохі і ранняга феадалізму належаць выяўленыя на Беларусі драўляныя, каменныя і металічныя антрапаморфныя ідалы (багі, балваны, ёлупы, каменныя бабы, куміры, стоды) з 1-4 абліччамі, якія стаялі на свяцілішчах (ахвярніках, бажніцах, капішчах, кумірнях (кумірніцах), трэбішчах, храмах ідальскіх) - старажытных месцах маленняў і ахвярапрынашэнняў. Мяркуецца, што большасць ідалаў не захаваліся з-за таго, што былі зроблены з дрэва, Распаўсюджванне хрысціянства таксама значна паўплывала на ступень захаванасці гэтых аб'ектаў, Нягледзячы на гэта, камяні і драўляныя аброчныя крыжы антрапаморфнага характару, якія можна лічыць своеасаблівымі адпаведнікамі ідалаў, ушаноўваюцца на Беларусі і да гэтага часу. Антрапаморфны вобраз камянёў і крыжоў ствараюць шматлікія аброкі з тканіны, хусткі, фартухі, пацеркі, якімі яны ўпрыгожваюцца. Часам антрапамарфізм праяўляецца і ў назвах сакральных камянёў - Дзед, Дзедаў Камень, Стары, Скамянелая Баба, Стук-Баба, Каменная Дзевачка і інш.

**Заамарфныя выявы.** Большасць заамарфных вобразаў на Еўразійскім кантыненце паходзіць са старажытных часоў, калі яны і былі семантычна вылучаныя. Ужо ў эпоху палеаліта існавалі пластычныя аб'екты і выявы мамантаў, насарогаў, ільвоў мядзведзяў бізонаў, коней, ласёў, аленяў, казлоў, кабаноў, ваўкоў зайцоў, рыб, змей, птушак і інш., якія, як мяркуюць даследчыкі, выкарыстоўваліся ў рытуальных дзеяннях, звязаных з паляўнічай магіяй. На блізкіх па культуры помніках Сярэдняга Падняпроўя - палеалітычных стаянках каля в. Елісеевічы і

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

в. Юдзінава Бранскай вобласці (Расія) - археолагамі былі знойдзены фігурка рыбы і галоўка птушкі. На тэрыторыі Беларусі пластыка і графіка зааморфнага характару вядомая з канца каменнага - пачатку бронзавага веку. Так, на стаянцы каля в. Асавец Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці знойдзены посуд з гравіроўкай са стылізаванымі выявамі птушак і змей, фігурка змяі, галава качкі і фігуркі птушак, фігурка аленя (ці лася), амулеты ў выглядзе рыб і іншая зааморфная пласты ка з косткі і рога. Вядомыя таксама выявы качкі на абломках неалітычных гаршчкоў са стаянак кал я в. Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці і в. Асавец Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці.

Да зааморфных знаходак жалезнага веку адносяцца каля 90 керамічных фрагментаў фігурак жывёлін, пераважна коней з гарадзішча мілаградскай культуры каля в. Гарошкаў Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Адзінкавыя знаходкі вядомыя таксама з гарадзішчаў каля в. Чаплін, в. Мохаў, в. Мілаград. Амаль заўсёды фігуркі сустракаюцца ў жылых і гаспадарчых пабудовах, а таксама ў комплексах, звязаных з культавымі дзеяннямі. Толькі ў адным выпадку конь знойдзены ў цэлым выглядзе, у астатніх выпадках фігуркі прадстаўлены ў выглядзе абломкаў Памер пластыкі - 6-8 см, колер гліны шэры і шэра-жоўты. Акрамя коней, трапляюцца фрагменты, па якіх можна меркаваць, што рабіліся таксама фігуркі буйной рагатай жывёлы, сабакі. З гарадзішча мілаградскай і зарубінецкай культур каля г. п. Уваравічы Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці паходзіць літая фігурка каня, якая ўваходзіла ў склад скарба бронзавых упрыгожванняў. Таксама вядомы гліняны сабака жалезната веку з гарадзішча каля в. Мыслі Капыльскага раёна Мінскай вобласці.

Сярод археалагічных знаходак канда I - пачатку II тысячагоддзя н, э. варта адзначыць зааморфныя амулеты і падвескі. Касцяныя птушкі-абярэгі («качкі») сустракаюцца ў курганах крывічоў канца VIII - IX ст. кал я в. Баркі Полацкага раёна і в. Бяскатава Гарадоцкага раёна. Таксама вядомая падвеска-амулет у выглядзе стылізаванай фігуркі птушкі з латгальскага селішча каля в. Пруднікі Міёрскага раёна.

Знаходкі касцяных конікаў паходзяць з курганнага могільніка радзімічаў Х-ХП стст. каля в. Нісімкавічы Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці. У ХІ-ХШ стст. становяццараспаўсюджанымінатэрыторыі Беларусі плоскія металічныя падвескі-«канькі». Нягледзячы на такую назву, іх падабенства з выявай каня з'яўляецца дастаткова ўмоўным. Падвескі сустракаюцца на паселішчах і ў курганных пахаваннях (у асноўным жаночых) у вярхоўях рэк Дняпро, Заходняя Дзвіна - на Смаленскай, Полацкай землях. Асобныя знаходкі адзначаны на поўначы Скандынавіі, на сучаснай Беласточчыне, на поўначы Украіны. Падвескі-"канькі" лічацца характэрнай асаблівасцю полацка-смаленскіх крывічоў. Знаходкі іх вядомыя з Лагойска, Гальшанскага селішча, селішча Гарадзішча Мінскага раёна, гарадзішча Маскавічы Браслаўскага раёна і інш. Існуюць і аб'ёмныя металічныя падвескі-конікі, вядомыя з курганна-жальнічнага могільніка ХІІ1-Х1V стст., што каля в. Малявічы Вілейскага раёна Мінскай вобласці, з гарадзішча Маскавічы Браслаўскага раёиа, з Барысава, Віцебска.

У племянным арэале радзімічаў сустракаюцца круглыя літыя бронзавыя падвескі з выпуклай выявай галавы быка, 7 фігуркамі вакол яе і 52 выпуклымі кропкамі па краі. Даследчыкі мяркуюць, што выявы на падвесках адлюстроўваюць каляндар, які быў сонечным і складаўся з 52-х сямідзённых тыдняў. Усяго такія падвескі вядомыя на 22 археалагічных помніках агульнай колькасцю не менш за 32 адзінкі. Акрамя арэалу радзімічаў, дзе гэтыя падвескі канцэнтруюцца, яны сустракаюцца таксама ў Цэнтральнай Беларусі, у нізоўях Заходняй Дзвіны, на Смаленшчыне, у былых Пскоўскіх і Наўгародскіх землях. Самыя аддаленыя знаходкі вядомыя ў Хедэбю (Германія). Датуюцца падвескі 2-й паловай Х-ХІІ стст, Большасць іх знойдзена ў жаночых пахаваннях, вельмі рэдка - на паселішчах. Сустракаюцца выключна на помніках са змешанымі славяна- балцкімі рысамі. Мяркуецца, што падвескі належалі язычніцкім жрыцам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да пачатку II тыс. н, э. адносяцца падвеска ў выглядзе рыбы з Гомеля і металічная рыбка-амулет з Магілёва XII-XIII стст.

Зааморфная пластыка з косткі, вядомая яшчэ з каменнага веку, працягвае існаваць і на мяжы I—II тысячагоддзяў н. э. Так, вядомая знаходка арнаментаванай галавы каня IX-X стст. з курганнага могільніка каля в. Рудня Полацкага раёна, а таксама арнаментаванай галавы казла X-XI стст. з курганнага могільніка каля в. Новыя Валосавічы Лепельскага раёна.

Працягваецца ў гэты перыяд выраб гліняных фігурак. На помніках пачатку II тысячагоддзя знойдзены гліняныя фігуркі свойскіх і дзікіх жывёл (авечкі, свінні, каня, лася і інш.), птушак і чалавека (Навагрудак, Полацк, Гродна, Ваўкавыск, Мсціслаў, гарадзішча Маскавічы Браслаўскага раёна). У пластах XVI-XVIII стст. таксама сустракаецца пластыка ў выглядзе розных жывёл і птушак, накрытая жоўтай, зялёнай, карычневай палівай або без яе (Віцебск, Мінск, Слуцк, Друя, Гарадок).

На працягу 2 тысячагоддзя антрапаморфныя і зааморфныя выявы сустракаюцца ў аздабленні прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, З археалагічных крыніц вядомыя накладкі, капавушкі, гузікі, спражкі, фібулы, шпількі, лыжкі, клеймы на кераміцы, кафля і іншыя рэчы, афармленыя такім чынам. Этнаграфічныя крыніцы дазваляюць дапоўніць гэты спіс - выявы людзей, звяроў, птушак сустракаюцца на тэррыторыі Беларусі ў драўлянай народнай скульптуры, на разьбяных ліштвах і вільчаках, у афармленні каваных клямак і дзвярных ручак, на тэкстыльных вырабах, абрадавых вырабах з цеста (пернікі ў выглядзе лялькі, каня, пеўня, казла, рыбы і інш., фігуркі на вясельны каравай у выглядзе качкі, курыцы, казы, барана, зайца, мядзведзя і інш.) і г. д. Цікавасць уяўляюць таксама абрадавыя маскі (напрыклад, калядныя маскі каня/кабылы, жураўля/бусла, мядзведзя, казы/казла, ваўка, дзятла). Некаторыя аб'екты сакральнай геаграфіі Беларусі звязаныя з прадстаўнікамі фаўны. Так, напрыклад, малюнкі сабакі, пеўня, ката і бусла былі праскрабаны на Святой сасне ў Шчыткавіцкай прошчы (Старадарожскі раён), Вядомыя таксама камяні-валы, камяні-мядзведзі, камяні са слядамі аленя, зайца, мядзведзя, лісіцы, ваўка, быка, казы, каня, ката, камяні, звязаныя са змеямі. Шэраг назваў гарадзішчаў, стаянак, курганных могільнікаў, балот, лясоў звязаны з тымі ці іншымі прадстаўнікамі жывёльнага свету, напрыклад, гарадзішчы Змееў Курган, Буслава Тара, Бык, Вакунь-горад, Каза, Турава Гара, Каза-балота, Кабыліна балота і г. д.

Такім чынам, можна адзначыць, што на тэрыторыі Беларусі ў якасці ключавых здаўна семантычна вылучаны пэўныя фаўністычныя прадстаўнікі. Выявы і фігуркі мядзведзя, ваўка, лася, зайца, сабакі, казы/казла, каня, вала/быка, барана/авечкі, свінні, птушак (качкі, зязюлі, бусла, дзятла, курыцы, пеўня), змяі, рыбы дайшлі да нас са старажытных часоў і вядомыя не толькі з археалагічных крыніц, але і па творах народнага мастацтва, жывога да нашага часу. Нагэтулькі ж старажытнымі з'яўляюцца і антрапаморфныя (жаночыя і мужчынскія) вобразы, якія, як і вобразы зааморфныя, верагодна, звязаныя з культам, магічнымі практыкамі, міфалагічнымі ўяўленнямі.

**Традыцыйныя беларускія цацкі.** Антрапаморфныя і зааморфныя вобразы ўвасабляюцца і ў традыцыйных беларускіх цацках. Нягледзячы на тое, што большасць з іх датуецца XIX - XX стст. і ў гэты перыяд яны выкарыстоўваюцца ў асноўным у пазаабрадавай дзейнасці, усё ж абрадавы бок іх функцыянавання ў культуры таксама фіксуецца. Так, абрадавыя лялькі ці падобныя антрапаморфныя аб'екты выкарыстоўваюцца ў рытуальна- магічных практыках падчас асноўных традыцыйных святаў гадавога кола - на Каляды, Масленку, Ушэсце, Тройцу, Купалле, Зажынкі і Дажынкі, Кузьму-Дзям'яна і інш. Выкарыстоўваюцца лялькі таксама і на традыцыйным вяселлі падчас розных яго момантаў: у час падрыхтоўкі да вяселля, падчас выкупу нявесты, пасля ад'езду маладой да маладога, у час, калі маладыя прыязджаюць на двор жаніха, перад клеццю і пасля клеці, на пярэзвы і інш. Такія лялькі маюць выразны медыятыўны ха-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рактар, які праяўляецца праз семантыку іх канструкцыі, матэрыялаў, характар выкарыстання, і адыгрываюць важную ролю ў забеспячэнні плоднасці зямлі і чалавека. Акрама гэтага, рабіліся лялькі ў лекавых мэтах, дзеля пазбаўлення немаўляці ад крыксаў [6, с. 230], а таксама для варожбаў, дзе сімвалізавалі дзяцей, народжаных паза шлюбам [7, с. 71].

Пазаабрадавымі з'яўляюцца разнастайныя антрапа- і зааморфныя цацкі для дзіцячай гульні. Сярод іх можна вылучыць, па-першае, тэкстыльныя цацкі. У гэтую групу ўваходзяць лялькі, якія ў асноўным адлюстроўваюць вобраз немаўляці ці жанчыны, а таксама зайчыкі з хусткі. Другую групу складаюць драўляныя цацкі - птушкі, коні, валы, механізаваныя «пільшчыкі», «дрывасекі», «кураняты». Пры гэтым адным з персанажаў у такога кшталту механізаваных цацках з'яўляецца мядзведзь, які дапамагае чалавеку ў пэўнай працы, часта ў кавальстве. Да трэцяй групы адносяцца гліняныя цацкі-свісцёлкі ў выглядзе людзей, дзікіх звяроў, хатніх жывёл і птушак. Найбольш папулярнымі вобразамі тут з'яўляецца пара (мужык і баба, кавалер і паненка), коннік або вершнік, певень, курыца, качка, казёл, конь, баран, свіння, сабака, птушка-конь і інш. Усе гэтыя вобразы звязаныя, з аднаго боку, з натуральным прыродным асяроддзем чалавека, а з другога боку, з традыцыйнымі міфалагічнымі ўяўленнямі і актуалізуюцца ў культуры як у прафанным, так і ў сакральным кантэксце. Як і старажытная антрапаморфная і зааморфная пластыка, традыцыйныя цацкі невялікіх памераў, зробленыя з натуральных матэрыялаў, дастаткова простыя, не дэталізаваныя, амаль не дэкараваныя, але пры гэтым вельмі выразныя і нагадваюць знак. Характэрнымі рысамі беларускіх цацак з'яўляюцца прастата і статычнасць вобразаў.

Нягледзячы на тое, што выкарыстоўваліся цацкі падчас дзіцячых гульняў, якія не насілі выразнага абрадавага характару, усё жтакія гульні ўспрымаліся ў пэўным сэнсе як дзеянні сакральныя, усведамлялася пэўная сувязь паміж гульнёй дзіцяці і ўплывам яе на будучыню сям'і. Напрыклад, беларусы Віцебшчыны лічылі, што празмернае захапленне дзяцей гульнёй у лялькі прадказвала з'яўленне ў сям'і новага дзіцяці, неахайнае стаўленне да лялькі ўказвала на хваробу кагосьці з сям'і, а закапванне лялькі ў яму ці кіданне ў снег прадказвала хуткую смерць у хаце [8, с. 28]. М. Я. Нікіфароўскі адзначаў, што якім бы нешчаслівым ні было значэнне дзіцячай гульні, моцна саграшыў бы той, хто яе перарваў [9, с. 381].

**Заключэнне.** Прааналізаваўшы археалагічныя і этнаграфічныя матэрыялы, мы можам зрабіць выснову аб тым, што ўжо пачынаючы з эпохі палеаліту чалавекам былі семантычна вылучаныя пэўныя антрапаморфныя і зааморфныя вобразы, большасць з якіх дайшлі да нашага часу, у тым ліку і праз такую форму, як традыцыйная цацка. Правобразам беларускай абрадавай і пазаабрадавай цацкі можна лічыць старажытную антрапаморфную і зааморфную пластыку. Цацачныя вобразы жанчыны, мужчыны, птушкі, каня, быка, казла, мядзведзя захавалі архаічную прастату, статыку і сувязь са сферай сакральнага.

## ЛІТАРАТУРА

1. Столяр, А. Д. Происхождение изобразительного искусства / А. Д. Столяр. - М.: Искусство, 1985. - 298 с.
2. Ефименко, П. П. Первобытное общество / П. П. Ефименко; Акад. наук Укр. ССР, Ин-т археологии. - 3-е изд., пере- раб. и доп. - Киев: Академия наук Укр. ССР, 1953. - 664 с.
3. Замятнин, С. Н. Очерки по палеолиту / С. Н. За- мятнин; Акад. наук СССР, Ин-т археологии. - М.-Л.: Изд-во Акад, наук СССР [Ленингр. отд-ние], 1961. - 176 с.
4. Окладников, А. П. История Якутской АССР: в 3 т. / А. П. Окладников. - М.-Л.: Изд. АН СССР, 19S5. - Т. 1: Якутия до присоединения к Русскому государству. - 430 с.
5. Формозов, А. А. Памятники первобытного искусства на территории СССР / А. А. Формозов. - 2-е изд., дои. и перераб. - М.: Наука, 1980. - 135 с.
6. Валодзша, Т. Цела чалавека: слова, міф, рытуал / Т. Валодзіна. - Мінск: Тэхналогія, 2009. - 431 с.
7. Гульні, забавы, ігрышчы / уступ, арт., уклад. А. Ю. Лоякі. - 3-е выд. - Мінск: Беларус. навука, 2003. - 534 с.
8. Виноградова, Л. Н. Кукла / Л. Н. Виноградова, С. М. Толстая // Славянские древности: этнолингвистический словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. - М., 2004.-Т. 3:К-П.-С. 27-31.
9. Мельников, Г. П. Игрушка / Г. П. Мельников // Славянские древности: этнолингвистический словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н. И. Толстого. - М„ 1999. - Т. 2; Д-К (Крошки), - С. 378-380.

*ГІаступіўу рэдакцыю 01.12.2011 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ